Przesyłka opłacona ryczałtem.

№ 24 Нядзеля, 14-га Верасьня 1924 г. Год І.

ГРАМАДЗКІ ГОЛАС

Выходзіць тры разы ў тыдзень. Цана нумару 15 грошай.

Падпісная цана на 1 месяц 1 злоты 80 гр. За граніцу ўдвая даражэй.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Людвісарская вул. дом № 4. (Wilno, Ludwisarska 4). Рэдакцыя адчынена ад 10—2 гадз. Рэдактар прымае ад 11—1 гадз. удзень, апрача сьвятаў.

Цана абвестак на 1 стар. — 15 гр. за радок пэтыту: у тэксьце — 10 гр. на апош. стар.— 5 гр.

Новая партыя.

Беларускі палітычны нацыянальны рух, стыхійна падняты Расейскай Рэвалюцыяй у сваім пачатку йшоў выключна нацыянальным шляхам.

Інтэлігенцыю цікавіла толькі адное: падняць нацыянальнае самаазначэньне народнае масы.

Тых напрамкаў палітычнае думкі, тых разьдзяленьняў, якія, напрыклад, былі сярод расейскай інтэлігенцыі, альбо тых, якія цяпер істнуюць сярод польскае інтэлігенцыі, ў нас ня было, ды й не магло быць.

Першымі, хто выступіў у гэты момант больш-менш арганізавана — гэта былі беларускія соцыялісты - рэвалюцыянэры. Можна сказаць, што гэта была першая арганізованая палітычна-соцыяльная групіроўка сярод беларускіх інтэлігентаў.

Рыскі падзел яшчэ больш пагоршыў палажэньне беларускай інтэлігенцыі.

Частка яе засталася ў Радавай Беларусі.

Добра ведаем, што галоўным палітычна-соцыяльным лейт-мотывам там, за кардонам, зьяўляецца камунізм.

Расейскія камуністы, захапіўшы ўладу у свае рукі, аб'явілі дыктатуру пролетарыяту.

Якая-б ні была дыктатура, яна адрозьніваецца ад усякае другое ўлады сваім абсолютызмам і нецярпімасьцю для сваіх палітычных ворагаў. Ясна, беларускай інтэлігенцыі, знаходзячайся ў такіх варунках палітычнага жыцьця, прыходзіцца туга.

Бальшавікі дазваляюць думаць толькі па іхняму трафарэту, ўсякае адступленьне ад гэтага трафарэту ёсьць контр-рэвалюцыйнасьць.

Пры такіх варунках свабоднае развіцьцё палітычнай альбо соцыяльнай думкі абсолютна немагчыма.

Інтэлігента бальшавіцкая ўлада толькі церпіць, як пэўную фаховую сілу, дае яму працу, корміць яго, але думаць пасвойму яму не дазваляе.

Ясна, што пры такіх варунках ніякіх групіровак інтэлігенцыі па палітычным альбо соцыяльным ад'знакам у Радавай Беларусі няма.

Тут, у нас, пры варунку конституцыйнае формы ўлады, палажэньне гэтага самага інтэлігента абсолютна другое.

Тут у нас кожны можа свабодна думаць і ня толькі думаць, але нават сваю думку папулярызаваць.

У нас магчыма выдаваць газэты розных кірункаў, у нас магчымы розныя кірункі палітычнай думкі.

Усё тое, аб чым інтэлігент Радавай Беларусі можа толькі лятуцець, у нас можна рэальна праводзіць у жыцьцё.

Нажаль толькі, што спачатку кірунак палітычнай думкі папаў і ў нас пад дыктатуру пэўных беларускіх дзеячоў.

І ў нас доўгі час было так, што беларус-інтэлігент павінен думаць так, як думаюць кіраўнічыя кругі палітычнай беларускай думкі. Гэта стварыла кружкоўшчыну, ў якую замкнулася беларуская інтэлігенцыя.

Так што і ў нас як-бы была свайго роду дыктатура.

Але з часам чары гіпнозу спалі і частка інтэлігенцыі выйшла на сваю ўласную дарогу. Цяжка было „дыктатарам" растацца з уладай.

І вось на шпальтах беларускіх газэт на сваіх-жа беларусаў, учарайшых супрацоўнікаў па выбарах у Польскі Сойм і інш. паліўся розны бруд, інсінуацыі. Але-ж і гэты мамант перажыты.

Цяпер у часткі інтэлігенцыі устанавілася цьвёрдая палітычная і соцыяльная пляцформа, якая давяла да стварэньня новай „Беларускай Дэмакратычнай Партыі", якая моцна стаіць на дэмакратычным грунце

Гэтая партыя, па сваёй праграме, лёяльна да Польшчы і, апіраючыся на Польскую Конституцыю, цьвёрда пастанавіла дабівацца ўсіх сваіх як палітычных, так і соцыяльных правоў.

Палітычны агляд.

Урэгуляваўшы рэпарацыённае пытаньне ў Нямеччыне, можна лічыць эўрапэйскі мір больш-менш забясьпечаным, хаця няма ведама, ці надоўга. Затое насьпяваюць і навет ужо пачынаюцца важныя палітычныя падзеі сусьветнага значэньня ў іншых частках сьвету. На першым месцы бязумоўна стаіць кітайскі канфлікт, які з кожным днём прыймае вялікшыя размеры, ўцягваючы ўва ўзаемную барацьбу найвялікшыя сусьветныя дзяржавы, як С. С. Р. Р., Кітай, Японія, Англія, Амэрыка, Францыя і Італія.

Цэнтральны пэкінскі дэмакратычны ўрад, хочучы захаваць добрыя адносіны да вялікіх дзяржаў-пратэктараў, зусім ня мае сіл, каб устрымаць разьвіваўшыяся падзеі. Абодва палітычныя цэнтры Кітаю — сталіца Пэкін і Шанхай, дзе галоўным чынам гуртуюцца чужаземцы, знаходзяцца пад ударам дзьвюх арміяў, у каторых бальшавікі маюць кіраўпічую ролю; на Пэкін з поўначы наступае манджурская армія Чан-Со-Ліса, а на Шанхай, як ужо раней было сказана, паўдзенная армія Сун-Ят-Сэна. І адна і другая карыстаюцца расейскімі гэнэраламі і афіцэрамі і маюць савецкія аэропляны і аружжа. Калі толькі гэтым дзьвём арміям удасца заўладаць двума галоўнымі палітычнымі цэнтрамі Кітаю, дык апошні аканчальна падпадзе пад уплывы бальшавікоў і тады магчыма будзе аружнае спатканьне Кітаю і С. С. Р. Р. з аднаго боку, а Амэрыкі, Англіі і Францыі—з другога.

Але ня толькі падзеі ў Кітаі зьвяртаюць на сябе агульную увагу. Ня менш цікаўны падзеі ў С. С. Р. Р., каторы жывець, як на вулькане. Быць можа, дзякуючы гэтаму, савецкі ўрад і шукае ратунку ўва ўсходняй авантуры, якая тады адцягне ўвагу грамадзян ад унутраных падзеяў. Бальшавікі радзіліся ў вайне й утрымаліся дагэтуль толькі дзякуючы вайне. На фоне супакойнага жыцьця лепш за ўсё выявілася іхняя нядзольнасьць кіраваць краем. Дзеля гэтага яны й кідаюцца з галавой у кітайскі вадаварот, каб адцягнуць агульную ўвагу ад унутраннага палажэньня ў С. С. Р. Р, якое надта паважнае і небясьпечнае для савецкае ўлады.

Згодна з заявай Г. П. У., зробленай Цэнтральнаму Палітычнаму Праўленьню ў Маскве, ува ўсім С. С. Р. Р. з кожным днём расьце агульнае народнае нездаволеньне і разруха. Уплыў соцыяль-рэвалюцыянэраў расьце Ад жніўня зарэгістравана больш за 100 анты-савецкіх дэманстрацыяў. Больш за 20 бунтаў было зьліквідована аружнай сілай, пры гэтым шмат дзе войска адмаўлялася страляць. Сярод афіцэраў разьвіваецца антысавецкая прапаганда. Дык-жа з усіх савецкіх арганізацыяў самая кансэрватыўная па духу чырвоная армія, каторая як рэдыска—„чырвоная" толькі звонку, а ў сярэдзіне—„белая". І слухаецца савецкай улады толькі да часу, дзякуючы нязвычайнаму разьвіцьцю шпіянажа, які сочыць за ўсімі начальнікамі ў арміі. Але бунт чырвонай арміі, як і агульнае народнае паўстаньне, можа загарэцца зусім неспадзявана, стыхійна, бяз ніякай падгатоўкі, як пажар або паводка. Гэткі вось стыхійны характар мае паўстаньне ў Грузіі, якое распаўсюджылася амаль што не на ўвесь Каўказ. Бальшавікі ведама прадстаўляць яго, як загадзя падгатаванае зброўнае паўстаньне грузінскіх меншавікоў, а ўзапраўды, як аб гэтым падае да ведама адзін з меншавіцкіх прадстаўнікоў у Парыжы, паўстаньне ў Грузіі зусім ня мае арганізованага характару, а проста зьяўляецца рэзультатам стыхійнай ненавісьці населеньня да бальшавізму. Сягоньня загарэлася гэтакае паўстаньне ў Грузіі, Азэрбэйджане, Ленінградзе, Мелітопалі і на Волзе, а заўтра яно загарыцца ў дзесяцёх новых мясцох і захваціць увесь С. С. Р. Р., тым балей, што немагчымае палажэньне ў С. С. Р. Р. — голад, нясьпыняемы тэрор, бязупынныя палітычныя ссылкі, арышты і расстрэлы—лепш за ўсё прычыняюцца да ўзросту народнай ненавісьці. Бальшавікі бязумоўна адчуваюць прыбліжэньне свайго канца, дзеля гэтага яны кусаюцца, як мухі перад зімой.

З іншых палітычных падзей апошніх дзён трэба адзначыць рэвалюцыі ў Чылі (рэспубліка ў паўднёвай Амэрыцы, якая ляжыць на пабярэжжы Ціхага акеану), а таксама й нядаўна кончыўшаяся рэвалюцыя ў суседняй Бразыліі. Дзяржаўны пераварот у Чылі зрабіла армія і флёт без праліцьця крыві. Проста міністры і прэзыдэнт павінны былі пайсьці ў адстаўку на жаданьне арміі, а на іх месца селі прадстаўнікі арміі і флёту. Прычынай перавароту было хабарніцтва, якім быў заражаны ўрад і парлямэнт.

N.

Школьная Камісія пры Беларускім Грамадзянскім Сабраньні ў хуткім часе мае на мэце адчыняць **беларускія пачатковыя школы.**

Дзеля гэтага запрашаюцца ўсе асобы, якія хочуць працаваць на ніве роднае прасьветы, прысылаць адказы на гэткія пытаньні:

1. Прозьвішча й імя?
2. Бацькава імя?
3. Век?
4. Адукацыйны цэнз?
5. Настаўніцкі стаж?
6. Якія знае мовы?
7. Чым займаецца цяпер?
8. Дзе радзіўся?
9. Сямейны стан?
10. Адрэс?

Адказы на вышэйазначаныя пытаньні прысылаць па адрэсе: Wilno, ul. Ludwisarska 4, Białor. Zgrom. Obyw. Komisja Szkolna.

ПАЛІТЫЧНАЯ ХРОНІКА.

У Польшчы.

Незалежна ад новэлізацыі **законаў аб выкананьні зямельнае рэформы,** Міністар Зямельнай Рэформы зьбіраецца запрапанаваць Сойму новы проект закону, які устанаўляе прынцыпы парцэляцыі зямлі і фінансавай падмогі будучым набыўцом асадаў. Гэта ўжо чацьвёрты па парадку законапроект па гэтым пытаньні, які не дачакаўся прыняцьця яго заканадаўчымі ўладамі.

6-га і 8-га верасьня ў Закапаным адбыліся супольныя паседжаньні польскае й чэхаславацкае дэлегацыі пры міжнароднай дэлімітацыйнай камісіі, з мэтаю зрабіць турыстычную конвэнцыю.

Старшыня Рады Міністраў п. Ул. Грабскі меў даўгую нараду з польскім паслом у Бэрліне п. Альшэўскім, які прадставіў сытуацыю цяперашніх польскіх адносін з Нямеччынаю ў зьвязку з конфэрэнцыяй у Жэнэве, венскаю пастановаю аб опцы, а таксама імкненьнем да гандлёвых зносін з Польшчаю.

11-га IX пад маршалкоўствам прэм'ера У. Грабскага адбылася першая нарада аб дзяржауным бюд'жэце на 1925 год.

прычыны газэтных паведамленьняў аб новай рэдукцыі сярод дзяржаўных вураднікаў, „Dzień. Wil." з офіцыяльных крыніц перадае, што ніякіх новых рэдукцыяў не прадбачыцца. Перад 1. I. урад зробіць толькі рэарганізацыю раней прынятага пляну ашчоднасьці і на гэтым закончыцца праца ў гэтай галіне.

11-га гэтага верасьня Прэзыдэнт Рэспублікі прыняў у Спале міністра ўнутраных справаў Гюбнэра і міністра справядлівасьці Выганоўскага, прадставіўшых даклад аб рэзультатах сьледзтва па пытаньню аб кінэнай пэтардзе падчас пабыту п. Прэзыдэнта ў Львове.

За граніцай.

Югаславянскі міністар заграпічных справаў Марынковіч выказаўся, што Югаславія хіба што змушана будзе выступіць з Лігі Народаў, калі не анулюецца пастанова аб прыналежнасьці манастыра сьвятога Наума, дзеля таго, што пастанова гэта закранула сувэрэнітэт Югаславіі.

„Matin" паведамляе, што **францыя** вазьме удзел у пазычцы для Нямеччыны, прадбачанай плянам Даўса ў размеры 5 %.

Выясьнілася, што прэзыдэнт рэспублікі **Чылі** (Паўднёвая Амэрыка) пакінуў сваю пасаду не па сваёй волі, а быў скінены стварыўшымся ваенным кабінэтам.

На паседжаньні Лігі Народаў прадстаўнік **Баўгарыі** апісаў палажэньне свайго краю, які стогне пад цяжарам падаткаў, накладзеных на яго міравым дагаворам. Баўгарыя стаіць за арбітраж. Кальвоў выказаўся за мяшаныя камісіі Лігі Народаў дзеля ўрэгуляваньня палажэньня нацыянальных меншасьцяў. Як на прыклад, Кальвоў ссылаецца на грэцка-баўгарскую камісію.

Нямецкая газэта „Arbeiter Zeitung" паведамляе, што недалёка ад Тыфлісу ізноў аднавіліся бai. Да паўстанцаў далучылася шмат рабочых. Бальшавікі панясьлі вялікія страты. 24 соцыялісты на чале з Югулі расстрэленыя бальшавікамі, складалі меншавіцкі выканаўчы камітэт.

Чычэрын зьвярнуўся да французкага прэм'ера Эрыё з тэлеграмай, прапануючы ўзяць пад сваю веду архівы быўшага расейскага пасольства ў Парыжы. Эрыё адказаў тэлеграфам пацьвярджальна. Гэта першы крок да офіцыяльнага прызнаньня бальшавіцкага ўраду Францыяй.

Як піша рыская расейская газэта „Народная Мысль", над арганізатарамі неспакойства ў **Грузіі** прыведзены ў выкананьне прыгавар сьмерці. Паміж іншымі расстрэлены сябры цэнтральнага выканаўчага камітэту і заграпічнага бюра меншавікоў: Хамэрына, Джунгэлі, Чыхішвілі і Сабашвілі.

Паводлуг вестак, адтрыманых у Лёндане з добра паінфармованых японскіх крыніцаў, збройныя сілы Чан-Со-Ліна, якія знаходзяцца у **Манчжурыі,** складаюцца з 23 брыгадаў мяшаных і 4 брыгадаў кавалерыйскіх. 2/3 гэтых сілаў знаходзіцца пад асабістаю камандаю маршала Чан-Со-Ліна.

„Letuva" піша, што ў **Жэнэве** створана падкамісія для палітычных справаў. Найбліжэйшая мэта гэтае падкамісіі — разгляд літоўскага мэморандуму аб **Віленшчыне.** У склад падкамісіі ўвайшлі таксама й прадстаўнікі **Літвы, Латвіі і Эстоніі.**

Грэцкі старшыня міністраў заявіў журналістам, што камуністычны рух у **Грэцыі** падтрымліваецца Масквою. Мэтаю пропаганды зьяўляецца стварэньне аўтаномнае македонскае дзяржавы. Грэцкі ўрад замерваецца прыняць неабходныя рэпрэсыйныя меры

Паводлуг адтрыманых у Лёндане вестак з Пэкіну, ў **Манголіі** пашыраецца рэвалюцыйны рух. Забіта шмат чужаземцаў.

Паводлуг апошніх паведамленьняў з **Грузіі,** там адбываюцца моцныя бai з аддзеламі чырвонае арміі. Вайна ахапіла ўсю тэрыторыю Каўказу. Паўстанцы захапілі закаўкаскую чугуначную лінію.

Як паведамляюць з Вены, 11-IX была абвешчана на ўсіх мэталюргічных фабрыках і заводах **Аўстрыі** гэнэральная забастоўка Увечары венскі бурмістар Зэйтц прабаваў прымірыць рабочых з фабрыкантамі, але гэта не ўдалося. Канцлеру Зэйпелю, які знаходзіцца ў Жэнэве, выслана тэлеграма аб прыезьдзе ў Вену.

ТЫПЫ ПАЛЕСЬСЯ

(Глядзі № 23 „Грам. Голасу").

Мо' на касьцёх нашых калісь паўстане край наш родны, прачхнецца брат наш цёмны і збудуе хату, ў якой сам запануе...

Дык веры болей, моцы болей і пойдзем, браце, шляхам нашым да канца...

Хай крыж цяжкі!

Але будзе некалі хтось шляхам гэтым горда, сьмела ісьці бяз крыжа... І будзе гэта пэўна ісьці той, хто шляхам нашым за намі пойдзе!

Дык ня сумуйце, браточкі, што пытаюць вас «Хто ты?»

Хутка прыйдзе гадзіна — нас спатыкаць будуць здалёку, дзьверы ўва ўсіх хатах адчыняць, запрашаючы нас.

А ці зойдзем тады мы да іх?...

Будзем жыць жыцьцём сваім, сваім правам сьветлым як сонца, магутным, як бура!

І ня трэба будзе болей ні кіёў, ні торбы!..

Будзем вольна жыць!

Ось чуеце, браточкі: лес шумець пачынае, штось гамоне, кудысь кліча!

Чуеце??...

Кліча ён нас на шлях наш...

Моцна кліча!

Ківае зялёнымі галінамі, нібы паказваючы дарогу...

Дык уставайце браты! Уставайце, дось сядзець! Бярэм, пакуль што, торбы, кіі і гэй на шлях!

Ужо там зьбіраецца грамада і крыж цяжкі нясуць...

Ледзьве яго паднялі на плечы худыя...

Дык гэй, брацьця!

Хутчэй на дапамогу ім!

А там хоць згінем пад крыжам, але данясём яго да канца, ня кінем сярод дарогі...

Хай хоць на нашых касьцёх, але адродзіцца край наш родны...

XXVII.

Расстаньне.

Ужо сонца пачынала садзіцца, калі я зварушыўся і пачаў зьбірацца ў дарогу.

Міхась і Пётра прапанавалі мне пераначаваць, але я, ня гледзячы ні на якія прапановы, цьвёрда рашыў выйсьці ў дарогу з апошнімі праменьнямі сонца.

Міхасёў бацька прапанаваў ехаць канём і пасылаў Міхася запрагаць, але я стаяў на сваім, кажучы што халадком будзе добра ісьці.

Ось ужо зайграў апошні прамень на вярхох дрэваў і я пачаў дзякаваць сваім сябром за прытулак і шчырасьць.

Міхась, Пётра і Ганначка пашлі мяне праводзіць да вялікай грэблі.

— Калі-ж вы цяперака зайдзецеся да нас? — казала сумна Ганначка, глянуўшы мне ў вочы.

— Добра і сам ня ведаю, ось як будзе справа, дык забягу — адказаў я.

— Усё справы, — ўздыхнуўшы адказала яна, — а да мяне дык справы нікому няма...

Я зьдзіўленна паглядзеў на яе, але яна, махнуўшы галавой сказала:

— Давайце засьпявайма —

— А і праўда, — адазваўся Пётра.

— Трэба дзядзьку Дзяргача праводзіць сьпевам нашым...

— Міхась, пачынай! —

Праз момэнт тры моцныя, маладыя галасы засьпявалі...

Рэха ўторыла ім...

„Не загіне край забраны покі будуць людзі"...

Нясьліся па лесе, плылі ў даль сьвятыя словы, і сум браў мяне!..

Але ось і старая грэбля.

Моцны сьціск далоняў сяброў на разьвітаньне, і я астаўся адзін. Паглядзеў ім усьлед і крануўся далей...

Ангельскі ўрад Макдональда, з прычыны апозыцыі, выкліканай у краі падпісаньнем дагавору з С. С. Р. Р., арганізуе па ўсёй **Англіі** інтэнсыўную кампанію з мэтаю падтрыманьня агульнае палітыкі ўраду, асабліва паразуменьня з С. С. Р. Р.

Згодна з паведамленьнем **францускага** міністэрства загранічных справаў, Эрыё замерваецца ў блізкай будучыне прызнаць савецкі ўрад, пасьля чаго адбудуцца ў Маскве спэцыяльныя перагаворы аб дыплёматычных зносінах.

Агляд прэсы.

„Kurjer Poranny", кажучы аб прамове мін. Скржынскага на паседжаньні Лігі Народаў на тэму абароны нацыянальных меншасьцяў, між інш. піша гэтак:

> Міністар Скржынскі ў сваёй прамове выказаў усё тое, што зрабіў цяперашні ўрад, каб споўніць свае абавязкі ў адносінах да нацыянальных меншасьцяў. Гэта відаць былі рэчы для сабраўшыхся ў Жэнэве прадстаўнікоў сусьветных дзяржаў гэтулькі новыя, што гэтыя заявы, якія асьвятляюць добрую волю кіраўнікоў польскай дзяржавы, прыймаліся воплескамі. Польскі міністар адзначыў, што гэтую работу не аблягчае палітыка чужых дзяржаў, якія накідаюцца як заінтэрасованыя апякуны са сваімі інтэрвэнцыямі ў справах, каторыя належаць да ўнутранай палітыкі польскай дзяржавы. Мэта гэтых інтэрвэнцыяў, якія падтрымоўваюцца тайнай прапагандай, каб узмацаваць сэпаратныя імкненьні інародцаў, зусім ясная і ня мае нічога супольнага з гэтымі ідэаламі міру, у імя якіх утварылася Ліга Народаў і над зьдзейсьненьнем каторых цяпер працуе.
>
> Трэба адзначыць — піша далей „Kurj. Por." — што гэтую самую справу раней за мін. Скржынскага закрануў паўнамочнік Грэцыі п. Мікола Палітіс зараз пасьля прамовы аднаго з дэлегатаў Англіі, праф. Жыльбэрта Мюррая. Ен адзначыў, што безумоўна патрэбна, каб сыстэма апекі над нацыянальнымі меншасьцямі была такая, аб якой гаворыцца ў абязуючых дагаворах і каб ня была пратэктаратам нейкіх дзяржаў над часткамі насяленьня дзяржаў суседніх. Пратэксіі дзяржаў, якія хочуць мець права ўмешывацца ў адміністрацыю суседніх дзяржаў дзеля таго, што там жывуць у вялікшых або меншых масах іхнія аднапляменцы, ня маюць ніякіх законных асноваў, а могуць заліць сьвет вагнём і крывёй. Усе грамадзяне дзяржавы павінны быць роўныя перад законам і з імі трэба аднолькава абходзіцца, але ніхто з іх ані асабіста, ані грамадой ня можа мець права прасіць пратэкцыі ў чужаземнай дзяржавы, хаця-бы карыстаўся мовай яе грамадзян і меў да яе традыцыйныя сымпатыі. Гэткія рэчы ня толькі ня прыносяць дабра нацыянальным меншасьцям і не вытвараюць міжнароднай згоды, але, наадварот, выклікаюць у масах большасьці насяленьня ненавісьць да нацыянальных меншасьцяў і ствараюць між дзяржавы небясьпечныя непаразуменьні. Дык вось — кончыў Палітіс — абавязак Лігі старанна сачыць за тым, каб справа нацыянальных меншасьцяў не сталася повадам да дыплёматычных канфліктаў.

Справа Барыса Савінкова дагэтуль яшчэ ня сходзіць са старонак газэт. Цяпер адклікнуўся гэн. Булак-Балаховіч, колішні супрацоўнік Савінкова ў партызанцкай барацьбе з бальшавікамі. У доўгай гутарцы з супрацоўнікам варшаўскай газэты „Kurjer Poranny" Балаховіч узваліваe на Савінкова шмат рознай віны, вінавацячы яго між інш. у здрадзе ажно ў 1921 г. Цікаўна заява Балаховіча, у якой усю віну за пагромы, якія рабілі яго жаўнеры, узваліваe на Савінкова.

У белгародзкім „Новом Времені" паявілася надта цікаўная карэспандэнцыя бэрлінскага карэспандэнта. Ен піша, што ў ночы з 23 на 24 жніўня ў адным з бэрлінскіх рэстаранаў гутарыў з нейкім „чужаземцам", які займае адказнае становішча ў аліанцкай контр-разьведцы пры дзяржавах, паўстаўшых на тэрыторыі бyўшай Расейскае імпэрыі. Гэтая асоба, каторай прозьвішча карэспандэнт ня піша, ехаўшы праз Бэрлін у адну са сталіц Антанты са спэцыяльным рапартам у справе Савінкова, сказала між інш. вось што:

> З вялікімі доўгалетнімі труднасьцямі зроблена арганізацыя разьведкі ў Саўдэпіі, пачынае цярпець няўдачы, каторыя апрача вялізных грашовых расходаў прыносяць страту дзесяткаў людзей — найлепшых, найстарэйшых агентаў. Дайшло да таго, што ў апошнія часы ані адзін з высылаўшыхся намі людзей не вяртаўся назад. Мы склікалі конфэрэнцыі, праз цэлыя тыдні ламалі сабе галаву аб гэтую трагічную загадку, але ніяк не маглі дагадацца, скуль ідзе здрада. І толькі, як заўсёды, прыпадак даў нам у рукі ніткі, па каторай мы дайшлі ажно да кабінэту... Б. Савінкова! Гэта было так несьпадзявана, што шмат хто з нас не хацеў верыць. Мы зьвярнуліся да вышэйшай інстанцыі з пытаньнем, што рабіць і атрымалі адказ, каб усё засталося па старому. Загадалі нам толькі сарганізаваць спэцыяльны дагляд над нашым консультантам. І вось ад гэтага часу пачаўся выяўляцца гэты чартоўскі ланцуг падзей, каторы завёў Савінкова да III інтэрнацыяналу. Гэткім чынам, пачынаючы ад сакавіка, Савінкоў увашоў у тайную лучнасьць з агентамі комінтэрну ў асобах чырвоных дапляматаў і сыстэматычна здраджаў нас і вас. Усе працэсы, канчаўшыяся карай сьмерці, насілі назову „савінкоўскіх", і яны запраўды былі савінкоўскімі, але з другога канца... У палове ліпня мы дажадаліся, што комінтэрн праз сваіх тайных агентаў аканчальна дагаварыўся з Савінковым і вымагаў ад яго прыезду ў Расею. Уладжыліся згуляць камэдыю з яго нелегальным пераходам граніцы, судом, апраўданьнем і ўрэшце прынялі яго ў контр-разьведачнае бюро пры Комінтэрне... Тады мы пастанавілі недапусьціць Савінкова да пераходу граніцы. Было даручана пэўным людзём сачыць за здраднікам і забіць яго, калі будзе прыбліжацца да тэрыторыі С. С. Р. Р. Але прыпадак перашкодзіў і С. удалося перабрацца праз граніцу. Рэзультаты гэтага могуць быць вялізныя. Савінкоў за шмат ведаў, а чартоўская хітрасьць чырвоных катаў бязьмежна.

А ад сябе „Новае Время" піша:

> Азэфы — гэта прадукт грамадзкага разлажэньня і гнільля. І чымсь большы гэты расклад, тым ядавітшыя кветкі, якія з яго вырастаюць. І ўзапраўды трэба было спадзявацца, што ня бачаны яшчэ на сьвеце катух усерасейскага Г. П. У. павінен быў зрадзіць нейкую азэфіяду, ў параўнаньні з якой справа Азэфа выглядае як дзіцячая гульня.

Пісьмо з Менску.

Нам пішуць з таго боку гранічных стаўпоў:

„Хто раней бываў альбо жыў у Менску асабіста ў прадваенны час, той цяпер Менску не пазнаў-бы. Раней Менск быў звычайнае губэрнскае места і мала чым розьніўся ад другіх такіх самых губэрнскіх гарадоў.

Жыцьцё мясцовае бегла звычайным шляхам провінцыяльнага места. Цяпер Менск зьмяніў свой твар.

Менск — места з вялікім рухам. Адразу адчуваецца блізасьць граніцы. Менск цяпер — гэта вялізарны склад польскай контрабанды. Гандаль гэтымі контрабанднымі таварамі адбываецца абсалютна адкрыта.

У Менску яскрава адчуваецца імкненьне бальшавікоў рабіць уплывы на беларусаў, жыхароў Польшчы. Для гэтай мэты ўсё робіцца.

Расейскія бальшавікі ў „велікарускім цэнтралізьме" відзяць пагрозу для свае ўлады і дзеля гэтага іхняя палітыка даўно ўжо балянсуе паміж сваім уласным цэнтралізмам і жаданьнем змагацца з цэнтралізмам нацыянальным.

У аканчальным рэзультаце адтрымліваецца цэнтралізацыя адміністратыўнага апарату ўлады і дэцэнтралізацыя насяляючых бальшавіцкую Расею нацыянальнасьцяў. Спробы разьвіцьця цэнтрабежных нацыянальных дамаганьняў з магчымасьцю адмовіцца ад культурнай сувязі з Велікаросіяй далі цікавыя рэзультаты.

Выявілася, што самаазначэньне, як палітычнае так і культурнае зусім ужо не такое вялікае, як здаецца жыхаром і палітычным дзеячом Заходняе Беларусі.

У Менску гэта адчуваецца асабліва. Кожны грамадзянін Б. С. Р. Р. мае там поўную магчымасьць гаварыць, пісаць і павучаць сваіх дзяцей на беларускай мове.

Але, тым часам, у Менску мала хто гаворыць, чытае і павучае сваіх дзяцей у мове беларускай.

Палякі і жыды карыстаюцца сваімі мовамі, а праваслаўнае зрусыфікованае мяшчанства — расейскаю мовaю

XXVIII.

Гук грому.

Адзін ішоў я па грэблі.

Была ночка.

Месячык сьвяціў прыгожа, зьзялі зоркі агнямі, лёгкі ветрык цалаваў лісты галінаў...

Было ціха...

Лес быццам задрамаў, углядаючыся ў яскравае неба. Дубы, бярозы і ліпы прытуліліся да высокіх соснаў і шапталі ім таёмныя казкі.

Цудоўным выглядае ў гэту пару лес і той, хто часта бывае ў ім, толькі той любіць яго...

Няма такіх фарбаў, каб перадаць усю прыгожасьць палескіх лясоў!

Часам у гэтай жудасна-прыемнай цішы зьявіцца аднекуль, патрасе ўсё паветра, гук грому...

Задрыжаць дрэвы, зашуміць вецер мацней і зноў усё сьціхне...

Гэй! Хто паслаў цябе? Хто казаў табе пранясьціся над лесам заснуўшым?...

Мо' хочаш ты, каб лес пачаў гудзець?

Каб шум яго — братоў маіх разбудзіў?

Каб уставалі ўсе і гэтай ночкай сьвятой і ціхай, на раду сабраліся?

Ціха ўсё...

Няма адказу на запытаньне маё, але сэрцам я чую — гэта так!

Ен прыляцеў да нас у цёмныя лясы, каб падняць, каб узварушыць нас! Бо час настаў!

Хутка пройдзе ночка і сонца праменьні заблішчаць у кроплях расы.

Дык чаго-ж ты сьціх?

Чаго-ж не грукаціш мацней, чаго маўчыш?

Ціха ўсё...

Лес сьпіць...

А неба, неба далёкае з яскравымі зоркамі штосьць гамоне, кудысь кліча, заве...

Небу высокаму відней: недзе далёка зьбіраюцца хмары вялікай грамадой і хутка ўжо над лесам, што сьпіць, загрымяць, пабудзяць усю старонку, сьвятарны гук грому...

XXIX.

Ціха ўночы.

Ціха ўночы. Зоркі гараць высока — высока ў цёмным небе, глядзяць адтуль на цёмную зямлю, на якой панура раскінуліся вёскі, гарады, сярод якіх нядоля пануе, нуда і злосьць, на якой сьлёзы льюцца рэкамі і морам бушуе край...

Чаму так хораша ў небе?

Чаму?

Чаму няма там ні сумных гарадоў, ні вёсак, ні сьлёз? Чаму там вечна пануе спакой і нейкая радасьць ахопіць душу і сэрца, калі глянеш у далёкае неба, пакрытае зоркамі і нейкі сум апануе, калі па ім хмары бягуць і плачуць дажджом?..

А выйдзе месячак поўны на неба, агорне ціхім сьветам цёмную зямлю...

Маліцца тады жадае душа, плакаць аб нядолі, аб нудзе, што вечна над сэрцам пануе...

Ціха ўночы. Гараць зоркі...

Яны бачаць усё, ім відаць з вышыні, дзе ўсе яны, мае дарагія, па кім душа і сэрца баліць...

Дык гэтай ночкай маліцца буду я, каб пачуў мяне Бог...

Каб дапамог мне ўратаваць маю старонку ад нядолі, каб вёскі яе, гарады былі поўны шчасьця, лепшае долі, нябеснай цішыні...

Каб мір панаваў назаўсёды!

Каб болей ня чуў я, ня ведаў, ня бачыў ні сьлёз, ні крові...

Божа! У гэтым Ты нам дапамажы! Каб было так ціха, як уночы...

Ціха ўночы.

XXX.

Ярэм Дуб.

Ужо было далёка за поўнач, калі я, нарэшце, з грэблі схіліў на знаёмую сьцежку, якая вяла да хаткі лясьніка Ярэма Дуба. Прайшоўшы шагоў з пяцьсот, паказалася хата.

Нізкая хатка быццам урасла ў зямлю, быццам старалася схавацца ад людзкога вока, але той, хто ведаў да яе чуць прыкметную сьцежку, знаходзіў яе і заўсёды спатыкаў у ёй шчыры прытулак.

Дзяргач.

(Працяг будзе).

і толькі невялікая часьць мовою беларускаю.

Праўда, што беларускі рух у Менску падтрымліваецца радавою ўладаю, але падтрымліваецца не дзеля таго, што радавая ўлада шчыра да гэтага пытаньня адносіцца, а больш дзеля та го, каб мець уплыў на беларускае жыхарства ў Польшчы.

Напрыклад, у Менску істнуе беларускі унівэрсытэт, але ў гэтым унівэрсытэце лекцыі прафэсары чытаюць не пабеларуску, а ў большай сваёй часьці парасейску. Але улада называе гэты унівэрсытэт беларускім. Гэты тэрмін „беларускі" радавая ўлада прыдае да кожнага культурна-асьветнага пачынаньня ў Менску, але ўсюды на чале культурна-прасьветных інстытуцыяў сядзяць расейцы, якія ня хочуць згадзіцца з тым, што яны працуюць у беларускіх інстытуцыях. Так на агульны пагляд ствараецца ўражаньне, што Менск чыста беларускі нацыянальны цэнтр, а як разглядзім бліжэй, так і відзім, як з усіх куткоў выглядае самая што ні на ёсць расейшчына.

Але бальшавікі ідуць далей—усякі эміграт з Польшчы, кожны дэзэртыр з польскае арміі—гэта пажаданы госьць у Менску.

Такі госьць там адразу адтрымлівае поўнапраўнасьць. Такі госьць, калі ён здольны зараз-жа „обрабатывается" бальшавікамі ў пэўным напрамку.

У Менску друкуецца якраз амаль ня ўся тая агітацыйная літэратура, якая потым пашыраецца ў Заходняй Беларусі ў тысячах экзэмпляраў.

Вам, жыхаром Заходняй Беларусі, што цяпер знаходзяцца пад Польшчаю здаецца, што ў нас у Менску беларускі рай.

Але вы запамінаеце, што самая сыстэма бальшавікоў стварае паднявольнасьць.

У нас кожны чалавек мае права думаць толькі па трафарэту.

Усякае праяўленьне самастойнай думкі абсолютна не дазволена, даўнейшы царскі рэжым „не сметь рассуждать" праведзен ідэальна.

У С.С.Р.Р.

Галодныя бунты ў Бухары.

Маскоўская акадэмія навук нядаўна выслала ў Бухару экспэдыцыю вучоных. Падчас галодных беспарадкаў, усе сябры экспэдыцыі былі забіты. У Бухару былі пасланы чырвоныя войскі, якія патушылі бунт і зрабілі масавыя арышты сярод тых, хто рабіў галодныя бунты.

Палажэньне ў Грузіі.

Дзеля ўдачнае барацьбы з паўстанчым рухам сярод сялянства Грузіі Закаўкаская рада народных камісараў пастанавіла расквватараваць у сельскіх мясцовасьцях неспакойных вакругоў ваенныя аддзелы чырвонае арміі, адносячы ўсе расходы па утрыманьню іх на сельскія районныя рады. У Тыфлісе надходзяць ведамасьці аб тым, што паўстанчыя групы адцісьнены ад жылых мясцовасьцяў у горы. Імэрэтыя саўсім ачышчана ад паўстанцаў. 5-га верасьня ў Абхаскім вокрузе недалёка ад Батуму адбылася спатычка паміж паўстанцамі і ўрадовым войскам: паўстанцы разьбіты і пасьпешна адходзяць да турэцкае граніцы. Тэлеграфная й тэлефонная камунікацыя ў Батумскім районе перарвана. Прыбыўшымі з Поці панцырнікамі заняты Сухум.

Пісьмо ўдавы Плеханава.

Паказаньне Б. Савінкова, што ён быў камандзірованы ў студні 1918 г. „Донским гражданским совѣтом" дзеля перагавораў з Плеханавым аб уваходзе апошняга ў склад гэтага „Донского Совѣта", апратэстована ўдавою Плеханова.

Пісьмом, надрукованым у „Известиях" 4-га верасьня яна заяўляе:

„3-га лістапада 1917 году, гэта значыць за два з паловаю месяцы перад гэтым Плеханаў у адказ на прапазыцыю Савінкова ўзяць на сябе злажэньне міністэрства, тады, калі пабеданосныя казакі пасьля бітвы пры Пулкове ўвайдуць у Пецярбург", ясна й рашуча адкінуў гэту прапазыцыю. Наагул Плеханаў рашуча ня любіў у ім (Савінковым) склоннасьці да нікчэмных выступленьняў... гэты элемэнт у характары Савінкова называў авантурыстычным. Праз гэта Плеханаў заўсёды і нязьменна адкідаў усялякую практычную прапазыцыю, з якою да яго зьвяртаўся Савінкоў".

ТУТЭЙШАЯ ХРОНІКА.

= **Прыезд Дэлегата Ураду.** У нядзелю 14 верасьня вячэрнім цягніком прыедзе ў Вільню новы Дэлегат Ураду п. Уладыслаў Рачкевіч. У панядзелак нованазначаны дэлегат пяройме ўладу з рук п. В. Романа.

= **З Магістрату.** На апошнім паседжаньні гарадзкой фінансавай камісіі пастаноўлена зволньніць дырэкцыю віленскіх тэатраў ад платы за карыстаньне Бэрнардынскім садам на сымфанічныя канцэрты.

Што датычыцца субсыдыі для польскай опэры, аб якім прасіла магістрат дырэкцыя польскіх тэатраў, дык фінансавая камісія, з прычыны цяжкага фінансавага палажэньня гораду адмовілася субсыдыяваць опэру.

Просьба жыдоўскай гміны аб субсыдыі для дзіцячага аддзелу бальніцы ў Зьвярынцы аддадзена на разгляд камісіі грамадзкай апекі.

= **У праваслаўнай сэмінарыі.** Пачатак заняткаў у праваслаўнай духоўнай сэмінарыі 15 верасьня. Да гэтага часу кончыцца рэмонт памяшканьня.

Рэктар багаслоўскіх клясаў (I і II) праваслаўнай сэмінарыі епіскап Антоні прыедзе праз два тыдні.

= **Выстаўка мастацтва і рамёслаў.** У нядзелю 14 верасьня а гадз. 1 па палудні ў салі „Аполлё" на вул. Дамброўскага адчыняецца выстаўка мастацкіх і рамесьленых твораў.

= **Вандалізм.** 7 верасьня віленскія сапэры ладзілі ў Бэрнардынскім садзе гульні, рэзультатам якіх было значнае зьнішчэньне саду. Як відаць з пратаколу, зробленага Магістратам 9-га верасьня, сапэры, ладзячы свае гульні між інш. вось як гаспадарылі:

Езьдзілі па траве двуконнымі вазамі, капалі ямы, драпнымі вяроўкамі пазьдзіралі кару з дрэў, убівалі ў дрэвы цьвякі, якія пралазілі наскрозь праз дрэва, сяклі галіны дрэў, таптаілі траву, зьнішчылі клёмбы з цэнымі кветкамі. На увагі і протэсты гарадзкіх урадніках не зьвярталася ніякае увагі, а навет аднаго з іх (К. Барцішэвіча) па загаду афіцэра, сілай выкінулі з саду „каб не перашкаджаў працаваць".

Магістрат аблічыў страты на суму 438 зл. і паслаў рахунак да даводзтва сапэраў.

= **Самагубства ўрадніка Дэлегатуры.** У лесе за Зьвярынцам жанчына, зьбіраўшая сухое гальлё, заўважыла труп маладога чалавека. Была зараз-жа павядомлена аб гэтым паліцыя. Прыбыўшы на месца ўлада ўстанавіла, што нябошчык завецца Антон Кулакоўскі, бэўшы кіраўнік галоўнай канцэляры Дэлегатуры. Самагубца выстраліў сабе ў рот з рэвальвэру.

= **Забойства і самагубства.** У Падбярэзьзі Марыя Раманоўская, жыўшая з пшодоўнікам паліцыі Анатолям Савічам, стрэлам з рэвальвэру раніла С., а пасьля сама застрэлілася.

= **Самагубствы.** Лік самагубстваў у апошнія часы гэтак узрастае, што проста зьяўляецца пагроза эпідэміі.

10 верасьня павесіўся ў сваей кватэры нейкі Браніслаў Сушынскі. Прычына самагубства не высьветлена.

У вёсцы Празарокі знайшлі труп вучыцельніцы тутэйшай школы Цыцыліі Горнай. Думаюць, што яна напілася нейкай атруты.

= **Прапаў бяз ведама.** Больш як тыдзень таму назад прапаў бяз ведама бышы дзеляор Віленскае Беларускае Гімназіі п. Шалешка, які бяз ніякае прычыны, так сабе „дзеля скарачэньня штатаў" быў зволнены з пасады і ўжо доўгі час, будучы без работы, перажываў разам з жонкаю і маленькім сынам фармальную галадоўлю. Магчыма, што няшчасны Шалешка скончыў самагубствам.

УСЯЧЫНА.

Нязвычайны фэхтавальшчык.

4 верасьня ўвечары на вуліцах Варшавы было нязвычайнае здарэньне. На Сэнатарскай вул. № 6 нейкі чалавек разьбіў шыбу ў краме фірмы „Т. Банькоўскі і Кº", ускочыў праз разьбітую шыбу на вакно, схваціў адтуль вялізны зарубацкі нож даўжынёй каля метра і пачаў уцякаць у бок Мядовай вул.

Сталася ўсё гэта вельмі хутка.

Гук разьбітае вялізнае шыбы і від чалавека з раскудланымі валасамі і вялізным нажом, як меч, у руках, якім ён махаў ува ўсе бакі, паднялі на вуліцах паніку. Паліцыя хацела затрымаць вар'ята, але ён, абараняючыся сваім вялізным нажом, бег далей.

На Кракаўскім Прадмесьці яму загарадзілі дарогу нейкія афіцэры. Засіхацелі ў паветры шаблі. Загрымелі стрэлы паліцыі. Шалёны чалавек усё адбіваўся сваім нажом, як мечам. Адна афіцэрская шабля трэснула. Незнаёмы пабег далей і ўпёрся ў сьцяну Бэрнардынскага касьцёла, бароняючыся ўсьцяж сваім здабытым праз вакно нажом. Яго акружылі цесным паўколам паліцыя ды ваенныя. Зноў загрымелі стрэлы. На вуліцах зрабіўся страшэнны перапалох. Зьбеглася шмат народу. Звозчыкі і трамваі ўстрымаліся, ня могучы праехаць.

Але нязвычайны скандаліст захістаўся і ўпаў, нож вылецеў з яго рукі. Мамэнтальна яго схваціл і абліўшагася крывёй павялі ў камісарыят. Аднак ён меў яшчэ гэтулькі сілы, што вырваўся з рук паліцы. Але яго як-га ізноў схвацілі і павялі ў камісарыят, дзе ён ужо абамлеў. Вызваны доктар скорай помачы знайшоў на ём дзьве сечаныя раны на галаве, адну сечаную рану на твары, дзьве гэткія-ж раны на шыі ды пяць ран ад куляў. Няшчаснага вар'ята перавязьлі ў бальніцу сьв. Роха.

З дакумантаў, якія знойдзены пры раненым, даведаліся, што ён завецца Робэрт Гліцэ, 28 г., электратэхнік.

Няўжо-ж ня было іншага спосабу абязброіць вар'ята? Стрэлы ў цэнтры места на адной з найбайчэйшых вуліц лёгка маглі раніць людзей з публікі. На шчасьце абыйшлося бяз лішніх ахвяраў.

„Кир. Рог."

„Антыквары".

На банкеце, які наладзіў прэзыдэнт француcкай рэспублікі Думэрг для багатых амэрыканцаў, згуртаваных у Парыжы ў „Adwertosing Club", прапала 47 залатых ложачак.

На банкеце весяліліся, як сьлед, выпілі шмат шампанскага віна, сказана было шмат прамоваў. А калі госьці разыйшліся, гістарычная саля Элізэйскага палацу выглядала, як пабоішча, а апроч таго не далічыліся 47 залатых ложачак, якія памятаюць яшчэ часы Напалеёна I.

Француская прэса аб гэтым факце выражаецца іранічна, кажучы, што амэрыканцы *ня укралі* ложачак, але *калекцыянавалі* іх.

Дзеля таго, што тут замешаны й асобы высокапастаўленыя, судовае сьледзтва аб нязвычайных *калекцыянэрах* спынена.

Волат на ангельскай выстаўцы.

На ўсябрытанскай выстаўцы ў Уімблі, агульную сэнсацыю выклікаў нейкіс волат, зьявіўшыся там ў характары гасьця на аглядку выстаўкі.

Чалавек гэны вельмі заінтрыгаваў публіку і журналістаў, якія даведаліся, што гэта ёсьць голяндзец, нейкі ван-Альбэрт. Калі яго зьмерылі, дык аказалася што ён увышкі каля 3-х мэтраў (2 м. 85 см.). Зьяўленьне волата было повадам сьмяхотнага здарэньня. Уласьнік готэлю, ў якім ван-Альбэрт меў намер пасяліцца, гэтак перапудзіўся волата, што ажно забыўся з ім прывітацца!

Волат зьяўляецца об'ектам обсэрвацыі гасьцей готэлю, кэльнэраў і самога гаспадара. Вось-жа ўсе заўважылі што *ён зьядаў штодзенна* толькі на сьнеданьне: 15 яец, 3 вялікія рыбіны, 5 катлетаў, 2 талеркі супу, 12 булак і выпіваў 8 шклянак гарбаты!!

Як бачым, апрача вялікага ўзросту, ён вызначаецца і немалым апэтытам!

Паштовая скрынка.

Сяргею Сіняку і **Габрыелю Клакоўскаму:** Пісьма адтрымалі. Газэты высылаем; Я. Ардынскаму, Я. Гарбачонку, Юстыну Валіцкаму і Паўлу Касьцюкевічу.

Газэту прачытай і перадай суседу!

Той, хто умее чытаць, ніколі не паляянуйся прачытаць няпісьменнаму!

Выдавец: Беларускае Грамадзянск. Сабраньне. Рэдактар: Язэп Салавей. Друкарня „Lux", вул. Жэлігоўскага, 1. Тэлеф. № 203.